Камунікаты

**Дарафей Фіёнік**
(Бельск-Падляшскі)

## Грыневічы-Вялікія — нарыс гісторыі праваслаўнага прыхода

Грыневічы каля Бельска-Падляшскага складаюць два асобныя пасяленні: Грыневічы-Вялікія і Грыневічы-Малыя [у мясцовым вымаўленні: Грыневічы-Вэлікі і Грыневічы-Малые (даўней: Задні)]. Лёс гэтых двух сёл быў практычна непадзельны, аднак жа большую ролю ў гісторыі адыгралі Грыневічы-Вялікія. Тут жа з даўніх часоў знаходзілася царква св. Прарока Іліі, галоўны аб'ект нашага зацікаўлення.

Разнастайнае па прыродзе і краявідзе наваколле Грыневіч ужо ў каменным веку было месцам абжытым. Пагоркі-камы, працяг гацькоўскіх пасляледавіковых узвышшаў ды даліны рэк Белай і Арлянкі спрыялі актыўнаму тут пасяленчаму руху. Непадалёк сутокаў Белай і Арлянкі ў пачатку 20-х гадоў нашага стагоддзя адкрытая была стаянка чалавека эпохі неаліту. Зыгмунт Шміт, які праводзіў раскопкі, на аснове знойдзенай тут керамікі аднёс яе да насельніцтва балтыйскай групы[1]. Альжбета Кэмпісты грыневіцкую кераміку палічыла сходнаю з керамікай наднёманскага тыпу (параўнаўчы матэрыял з Беларусі паходзіць з III і пачатку II стагоддзяў да н. э.[2]

Апрача вырабу керамікі, у пазнейшы перыяд тутэйшыя жыхары займаліся жалезным промыслам. Можа пра гэта сведчыць існаван-

[1] Z. Szmit, *Sprawozdanie z poszukiwań archeologicznych w Hryniewiczach Wielkich*, „Wiadomości Archeologiczne” 1922, t. 7, s. 107-120.

[2] „Rocznik Białostocki”, t. XIII, s. 532.

не каля Грыневіч-Вялікіх урочышча з характэрнаю назваю „Рудплавіска”[3]. Іншыя цікавыя вывады прыносяць доследы могільнікаў з наваколля Грыневіч. Адкрытыя З. Шмітам ды, пасля II сусветнай вайны, Тэрэсай Дамброўскай магілы змешанага могільніка належаць як да пшэворскай, так і да зарубінецкай культур. Сведчыць гэта пра дэмаграфічныя змены, якія адбываліся на нашых землях у ранні перыяд жалезнага веку.

З могільнікавых помнікаў пазнейшай эпохі з тэрыторыі Грыневіцкага прыхода можна вылучыць сярэдневяковы могільнік, што знаходзіцца каля вёскі Белая. Могільнік распаложаны на высокім беразе даліны ракі Белай; цяпер часткова заараны. Можна тут яшчэ пабачыць камень з высечаным грэчаскім крыжам.

У X-XIII ст.ст. старанием рускіх князёў буйнее горад Бельск. Адбудаваны пасля мангольскіх знішчэнняў, ужо ў Вялікім княстве Літоўскім узмацняецца як гарадскі і абарончы цэнтр. У горад і яго наваколле прыбываюць новыя пасяленцы, часта з канкрэтнымі мэтамі. Так пісаў пра гэта Ежы Віснеўскі: „Władcy litewscy, aby umocnić swe panowanie na tych ziemiach, osadzili pod grodami i na szlakach głównych dróg pewną ilość wsi bojarów pochodzenia litewskiego i ruskiego, zobowiązanych do służby wojennej i zamkowej. Powstały osobne wysepki bojarskie litewsko-ruskie. Pod Mielnikiem tworzyła je wieś Moszczona, pod Drohiczynem Putkowice i Tąkiele, pod Bielskiem Hryniewicze”[4].

Падобны вывад знаходзім і ў вядомым творы бельска-віленскага гісторыка Язэпа Ярашэвіча. У *Obrazie Litwy* піша ён: „ (...) pojedynczy bojarowie dosługiwali się w wojsku szlachectwa, tak i całe osady bojarskie po szczegółowej wyprawie ogółem otrzymywali szlachectwo. O bytności takich osad natrąca też sama ustawa włóczna, ale wyraźniejszy tego przykład mamy na Podlasiu, gdzie dotąd kilka jest jeszcze okolic szlacheckich, których mieszkańcy, dziedziczne swe zaszczyty, winni są męstwu pradziadów. Byli to bojarowie w Hryniewiczach (Hornewicze), na Białej, na Woroniem, w Hoźnie za Narwią, w Bańkach, którzy jak się z przywileju Zygmunta Augusta r. 1569 na sejmie unijowym w Lublinie wydanym okazuje, należące przedtem do przesądu Zamku bielskiego i załogę jego składając, tym przywilejem od jurysdykcyi i służby zamkowej uwolnieni, już na dworze brańskim, zarówno z inną szlachtą sądzić się mieli”[5].

Першыя датаваныя весткі пра Грыневічы і іх жыхароў паходзяць аднак толькі з XVI ст. 14 мая 1569 года грыневіцкая шляхта, з ўсёй шляхтай Бельскай зямлі далі ў Бельску прысягу на вернасць Поль-

[3] Б. Рудкоўскі, *Наваколле Грыневіч*, „Ніва” 1989, н-р 20.

[4] J. Wiśniewski, *Osadnictwo Wschodniej Białostocczyzny*, „Acta Baltico-Slavica”, 1977, t. XI.

[5] J. Jaroszewicz, *Obraz Litwy*, Wilno 1844, cz. II.

скай Кароне. У акце прысягі пералічаны прозвішчы 48 чалавек з Грыневіч. Тут жа ўсе яны прыпісаны „de parochia Ruszka" (значыць, да парафіі рускай-праваслаўнай). Большасць пералічаных у акце жыхароў Грыневіч насіла характэрныя царкоўныя, рускія імёны, якія ў лацінскім арыгінале запісаны наступным чынам: *Alexius, Sienko, Nikolaus, Ostapko, Chwiedor, Iwan, Onisz, Hricz, Siemion, Ihnath, Opanas, Anchim, Makar, Trochim* і іншыя[6].

* * *

Акт 1569 года ўскосна паказвае нам на існаванне праваслаўнай царквы ў Грыневічах. Грыневіцкая шляхта ўжо даўно да гэтага магла заснаваць уласны прыход. Першая дакументальная вестка пра храм паходзіць, аднак, толькі з 1571 года. 14 чэрвеня свяшчэннік Іліінскай царквы ў Грыневічах а. Фёдар Яцковіч купіў ад тутэйшага землеўладальніка Лазкі Мацкевіча двор разам з пабудовамі. „Купчую грамоту", якую спісваў тагачасны бельскі дзяк Хведар Васілевіч Хмарыч сваімі пячаткамі пацвердзілі іншыя грыневіцкія землеўладальнікі Ячко Васілевіч Астрынскі ды Міхал Пракаповіч. Пры спісванні акта ўдзельнічалі таксама іншыя грыневіцкія шляхціцы Міхал Анісевіч (Онісэвіч) ды Сенька Тытовіч[7].

Не ведаем, ці а. Фёдар Яцковіч дачакаў у Грыневіцкім прыходзе падпісання Берасцейскай уніі. Не ведаем і часу пераходу Іліінскай царквы ў фактычнае падпарадкаванне уніяцкаму епіскапу. Мабыць, адбылося гэта неўзабаве пасля 1596 года. Грыневіцкая шляхта, у новых рэлігійна-палітычных умовах, пазбаўленая паўнаты грамадзянскіх правоў, прымала унію, а пасля і рымскі каталіцызм. Да палавіны XVII ст. яшчэ большасць роду Грынявіцкіх верная была ўсходняй Царкве. У дакуменце ад 1640 года знаходзім імёны 17 грыневіцкіх шляхціцаў. Частка з іх носіць характэрныя рускія імёны: Іван, Хведар, Філімон, Грыч, Пракоп, Ігнат, Мікалай[8]. Пры некаторых імёнах дадзеная таксама мянушка Гаеўнік.

У ІІ палавіне XVII ст. актыўныя і дзейныя Грынявіцкія, якія хочуць набілітавацца, паступова прымаюць рымакаталіцызм. Таму з часам і знаходзім іх на розных высокіх пасадах. У 1674 г. Павал Грынявіцкі выступае як скарбнік Бельскай зямлі. Ягоным наступнікам з'яўляецца Францішак Грынявіцкі, які ў 1697 г. стае дэпутатам „ad pacta conwenta" Аўгуста ІІ. У гэты час Міхал Грынявіцкі выступае як пробашч Камянецкай кафедры, луцкі канонік ды каронны дэпутат. Адным з найбольш славутых прадстаўнікоў роду быў Павал сын Міхала. Каспар Нясецкі ў „Гербарыі" піша: „Tenże pod-

6 *Akta Unii Polski z Litwą 1385-1791*, Kraków 1932.

7 *Акта издаваемые Виленской Археографической Коммиссиею*, т. 33, с. 72-73.

8 AP w Białymstoku, Księga Grodzka Brańska 1640-1641, k. 239.

pisał elekcyą Stanisława Augusta Króla z województwem podlaskim. Idąc w swem województwie przez stopnie zasług, obrany jednomyślną zgodą obywateli podkomorzym ziemi Bielskiej, i od Króla Stanisława Augusta orderem św. Stanisława zaszczycony”[9].

У пачатку XVII ст. большасць прыхаджан Савята-Іліінскай царквы ў Грыневічах была сялянамі з вёсак Катлы, Арлянка, Белая ды Суботка. У *Візітацыі* царквы ад 1727 года знаходзім таксама Грыневічы-Вялікія, Грыневічы-Меншыя ды Грыневічы-Махнікі (?). Невядома дзе знаходзілася яшчэ адна, згаданая ў дакуменце вёска — Лычана[10]. У наваколлі не знаходзім урочышча з такою назвай.

*Візітацыя* ад 1727 г. дае нам першае апісанне грыневіцкага храма. Пабудаваная ў XVII ст. невялікіх памераў драўляная царква мела адзін купал ды чатыры крыжы на даху. Званіца, на якой былі завешаныя тры званы 1664 года[11], стаяла асобна. У інтэр’еры храма прыцягвае ўвагу прысутнасць трох’яруснага іканастаса, які мог быць пабудаваны яшчэ да 1596 года. Цэнтральнае месца ў ім займалі царскія вароты „snicersko rznięte między kolumny z pozłotą bez żadney accomodacyi...”. Над царскімі вратамі і чатырма меснымі іконамі знаходзім ікону Тайнай Вячэры, Дэісіс ды іконы апосталаў. Трэці рад іканастаса складала восем вялікіх ікон, зместу якіх візітацыя не апісвае. У храме знаходзіўся таксама другі іканастас, у прыбудаванай пры алтарнай частцы капліцы Увядзення ў Храм Прасвятой Дзевы Марыі[12]. Апрача прыгожых іканастасаў храм быў багаты старадаўнімі іконамі.

У грыневіцкай царкве не бракавала таксама адпаведнага літургічнага начыння ды кніг. У 1727 г. знаходзім тут тры сярэбраныя пазалочаныя чашы ды прыгожа апраўленае сярэбранымі таблічкамі Евангелле *in folio*. На вылучэнне заслугоўвуюць таксама рукапісныя кнігі: Апостал, Мінея Празнічная ды Трыодзь *in folio* і друкаваны ў Вільні Служэбнік *in folio*.

Адносна багатае ўбранства храма ў вялікай ступені было заслугай *ктітараў* — грыневіцкай шляхты, якая, хаця спаланізаваная і акаталічаная, яшчэ нейкі час памятала пра свае карані, стараючыся даказваць гэта ахвярнасцю для Царквы. Прыход быў уласнікам каля дзесяці ўчасткаў зямлі, ахвяраванай у розныя перыяды тутэйшымі землеўладальнікамі. Найбольш, бо ажно тры ўчасткі ах-

9 Kacper Niesiecki, *Herbarz Polski*, Lipsk 1839.

10 AP w Lublinie, Wizyty dekanatu bielskiego, 1727, sygn. 780, k. 400.

11 tamże, por. Archiwum Cerkwi Preczystieńskiej w Bielsku Podlaskim (dalej: ACP), Главная опись Гриневичской Свято-Илiинской церкви... составлена в 1892 году, к. 1-2.

12 *Wizyty...*, да сёння ў грыневіцкай царкве ўрачыста святкуецца дзень Увядзення ў Храм.

вяраваў пан Маркевіч. У 1711 г. была пацверджана „Prezenta od Roznych Ich M. JM Collatorow Szlachty wszytkich”[13].

Апрача зямельных надзелаў царква атрымлівала таксама немалыя грашовыя ахвяраванні. У 1771 г. Ян Гаеўнік Грынявіцкі перадаў Іліінскай царкве грашовы фонд, раўнаважны 75 руб. з адначасовым запаветам служыць у год 36 Літургіяў у ягоную памяць. Другім буйным ахвярадаўцам быў а. Уладзіслаў Шумікоўскі, які ў 1792 г. даручыў царкве 150 руб. Працэнтамі ад гэтых сум, забяспечаных на маёнтках у Грыневічах і Суботцы, царква карысталася яшчэ ў 1873 г.[14] Айцец Уладзіслаў Шумікоўскі разам з жонкаю Анастасіяй былі таксама ахвярадаўцамі найбольшага 15-пудовага звана[15].

З надпісу на зване вынікае, што а. Уладзіслаў Шумікоўскі быў настаяцелем грыневіцкай царквы ў 1751 годзе. Яго непасрэдным папярэднікам быў відавочна а. Раман Рэшчыц, настаяцель храма з часоў *генеральнай візітацыі* 1727 г. Пад 1788 годам з метрыкі чыжоўскай царквы даведваемся, што настаяцелем (парохам) царквы ў Грыневічах быў а. Мікалай Даніловіч[16], бацька прафесара Ігната Даніловіча (1788-1845). Айцец Мікалай, святар рускага, шляхецкага паходжання, быў жанаты з Даміцэляй Міхневічовай, дачкой бранскага пароха. Дом ягоны быў наогул польскамоўны, а род — падзелены паміж уніяцкай Царквою і рымска-каталіцкім Касцёлам (брат а. Мікалая, Міхал, быў каталіцкім ксяндзом, а затым супрасльскім уніяцкім епіскапам).

У такой культурнай, дуалістычнай атмасферы выхоўваўся сын а. Мікалая — Ігнат, пазнейшы прафесар Віленскага універсітэта, карпатлівы даследчык рускай, вялікалітоўскай мінуўшыны. Дзесяць першых гадоў жыцця Ігната Даніловіча прайшло ў баярскіх Грыневічах, пад покрывам магутнага Бельска. Тут Ігнат пазнаваў першыя гукі роднай мовы, тут у царкоўцы ўпершыню дакранаўся да духоўнасці нацыі, яе даўніны і традыцыі. Грыневічы далі яму добрае натхненне для так плённай, будучай працы.

* * *

У 1839 г., калі грыневіцкая царква вярнулася ў праваслаўе, настаяцелем быў а. Станіслаў Асташэвіч. Амаль усе сяляне з Катлоў,

13 tamże.

14 АСР, Ведомость о церкви Свято-Иліинской, состоящей в селеніи Гриневичах... за 1883 год.

15 На зване, які цяпер знаходзіцца на званіцы Прачысценскай царквы ў Бельску, можам прачытаць надпіс: „Лета Господня 1751. Сооружи кимвал сей свяшенноіерей Владислав Шумиковскій со женою своею Анастасіею”, пар.: Главная опись... 1892 г., к. 1v. У 1795 г. а. Уладзіслаў з жонкаю ахвяравалі Прачысценскай царкве ў Бельску суму 150 руб. серабром.

16 Выпіска ў архіве а. Грыгорыя Сасны.

Белай ці Арлянкі беспраблемна вярнуліся ў веравызнанне продкаў. Шляхта ў большасці выпадкаў бліжэйшым палічыла рымска-каталіцкі касцёл. Працэс канчатковага адыходу грыневіцкай шляхты ад усходняй царквы наглядаецца ў дэмаграфічных даных. Калі ў 1828 г. прыход налічваў 568 вернікаў[17], дык у 1847 г. было іх толькі 556, у тым ліку 281 мужчын і 275 жанчын[18]. На адмоўныя дэмаграфічныя працэсы ў гэтым перыядзе паўплываў, аднак, не толькі адыход часткі прыхаджан ад Царквы, але і эпідэмія халеры, якая сабрала страшнае жніва на Падляшшы ў 1830 годзе.

У 1847 г. а. Станіслава Асташэвіча на Грыневіцкім прыходзе замяняе а. Платон Ральцэвіч, які служыць тут да канца 1863 г. Разам з прыхаджанамі ў 1862 г. праводзіць капітальны рамонт царквы і званіцы. Трэба адзначыць, што тагачасны храм не быў ужо тым, які ведаем з апісання 1727 года. Відавочна той храм згарэў, бо ўнутранае ўбранства царквы II пал. XIX ст. даволі беднае. „Главная опись", складзеная ў 1892 годзе вось так яго апісвае: „Церковь имеет вид прямоугольника с небольшим притвором, сделанным из досок. Ризница приделана с левой стороны. Стены церкви снаружи и с внутри обиты досками, крыша гонтовая, на ней, на середине, сделан небольшой, деревянный купол, обитый белою жестью, с железным на вершине крестом... Пред входом в церковь, на левой стороне, построена на четырех столбах, скрепленных поперечными перекладинами — кокольня в виде башни... Иконостас деревянный столярской работы, окрашен белыми масляными красками под лак с позолоченною по местам резьбой и увенчан позолоченным деревянным крестом, в один ярус"[19].

Тагачасны іканастас, хаця небагаты ў параўнанні з трох'ярусным іканастасам 1727 г., звяртаў, аднак, увагу сваёй старадаўняй арыгінальнасцю. Заўважыў яго ў сваёй працы сам Павал Пакроўскі[20]. Апісальнік іканастаса з 1881 г. вельмі, аднак, крытычна аднёсся да яго выгляду: „(...) топорной работы иконостас, в котором кроме двух местных, довольно благообразных икон, было размещено, без всякой симетріи, многое множество, разнаго рода, разнаго достоинства и разнаго размера"[21].

Рамонту патрабавала не толькі царква, але і прыхадскі дом. Гэты апошні быў годны толькі разборкі. У 1870 годзе стараннямі а. Ула-

17 Archiwum Diecezjalne w Drohiczynie, Akta Dekanatów Unickich, Ведомость в деканате бельском собранная за год 1828.

18 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 21, адз. зах. 282, л. 42.

19 АСР, Главная опись...

20 П. Покровскій, *Археологическая карта Гродненской Губерни*, Вильна 1895.

21 „Литовскіе Епархіальные Ведомости" (далей: ЛЕВ), 1881, н-р 7.

дзіміра Маркевіча (ад 1866 г. настаяцеля Грыневіцкага прыхода) ды прыхаджан будуецца новы дом[22]. Стае ён на традыцыйным месцы, над ракою Белай. Каб дабрацца да царквы, распаложанай на пагорку сярод заліўных лугоў, трэба было пераходзіць два масткі і грэблю. Вясною ці мокрай восенню, калі Белая разлівалася, святару і прыхаджанам часта даводзілася дабірацца ў храм чаўнамі.

Распалажэнне грыневіцкай царквы на так недаступным месцы з загадкавай назваю „Стояхново” відаць не выпадковае. Сярэдневяковыя продкі маглі тут заснаваць зручнае абарончае гарадзішча з храмам на ім. Брак археалагічных доследаў не дазваляе праверыць гэтую прадпасылку.

Тым часам дворская частка Грыневіч, дзе знаходзіўся маёнтак Саковічаў, з 1864 года пачынае жыць новым жыццём. Не маючы нашчадкаў, Ян Саковіч выстаўляе маёмасць на продаж. Бесканкурэнтнымі пакупнікапі 113-ці дзесяцін зямлі ды дворска-паркавай часткі маёнтка становяцца чатырнаццаць гаспадароў, пераважна з Аўгустова каля Бельска: Навіцкія, Ляшэвічы, Заброцкія, Бусловічы, Садоўскія і іншыя. Новыя жыхары Грыневіч адразу становяцца дарагімі Царкве прыхаджанамі.

Згаданы раней а. Уладзімір Маркевіч у 1874 годзе пачаў абнаўленне храма. Быў ён ашаляваны ды памаляваны ўнутры алейнымі фарбамі. Перабудавалі таксама іканастас[23]. Следам за рамонтам прыхаджане пачалі актыўна ахвяроўваць царкве літургічнае начынне, аблачэнні ды іншыя прадметы. Айцец Уладзімір умеў згуртаваць людзей пры царкве. На жаль, заўчасная ягоная смерць у 1880 г. не дазволіла здзейсніць усе намеры. У некролагу, які памясцілі „Литовскіе Епархіальные Ведомости” падкрэсліваецца актыўнасць маладога святара ў духоўным і асветна-культурным жыцці прыхода. Глыбокія, кранальныя пропаведзі гаварыў ён на „простом наречьи”. Гэта спрыяла добрым і блізкім адносінам да свяшчэнніка[24].

Наступнікам памерлага а. Уладзіміра стаў а. Іаан Пісканоўскі. Высокаадукаваны, як у багаслоўскіх, так і ў філасофскіх ды фізіка-матэматычных навуках а. Іаан дасканала разумеў важнасць пісьмовай адукацыі сваіх прыхаджан. Яго стараннямі ў 1884 г. у найбольшай вёсцы прыхода — Катлах была адкрыта царкоўна-прыходская школа. Школа адразу атрымала грамадскае памяшканне[25]. Доўгі час навучалася ў школе не больш 30-ці дзяцей. Нейкі час усе

[22] АСР, Ведомость о церкви Свято-Иліинской состоящей в селеніи Гриневичах... за 1883 год, к. 1.

[23] Литовские Епархіальные Ведомости (далей: ЛЕВ) 1881, с. 50.

[24] ЛЕВ 1881, с. 50-54.

[25] АСР, Ведомость о церкви... за 1886 год.

школьныя заняткі вёў мясцовы псаломшчык. Калі ў 1895 годзе быў пабудаваны і пасвячаны новы будынак, школа мела ўжо свайго пастаяннага настаўніка. Быў ім Карніл Саўчук[26]. Закону Божага ў школе вучыў а. Іаан, якога ў 1896 г. назначылі *наблюдателем* царкоўна-прыхадскіх школ у Бельскім павеце.

Вядома, школа была таксама важным цэнтрам культурнага жыцця прыхода. Да нашых дзён дайшло апісанне святочнай ёлкі 1899 г. у той жа катлоўскай школе. Апрача дзіцячых вершаў, царкоўных спеваў, гучалі на ёлцы і велічальныя словы для расійскага імператара, напрыклад, песня „Славься, славься наш русскій Царь”[27].

Адначасова з развіццём школьніцтва таксама грыневіцкая царква ўзбагачаецца новымі ахвяраваннямі. Паступаюць грошы, купляюцца новыя аблачэнні, а ў 1894 годзе дабудоўваецца званіца над прытворам. У гэтым жа годзе ў храм купляецца новае панікадзіла коштам 50 руб.[28] Варта таксама адзначыць ахвяру 100 рублёў ад а. Іаана Сяргеева (св. Іаана Кранштацкага)[29]. Сярод прыхаджан у ахвяраваннях вылучаліся асабліва багатыя жыхары Грыневіч-Двара: Я. Бусловіч, А. Ляшэвіч, А. Навіцкі ды Я. Садоўскі, якія ахвяравалі храму тры пары святарскіх аблачэнняў.

У апошнім дзесяцігоддзі XIX ст. Грыневіцкі прыход узбагаціўся новай капліцай у гонар Пакровы Божай Маці і св.св. Братоў Макавеяў. Узведзена яна была ў 1892 г. на месцы з’яўлення жыхаркам Арлянкі Божай Маці. Каплічка стаіць да сёння на невысыхаючай крыніцы з цудатворнай вадою. Яшчэ перад эпохай меліярацыі было тут ледзь праходнае балота, мелі прыстанішча вадзяныя птушкі. У 1985 годзе адсюль была ўкрадзена старадаўняя ікона Багародзіцы.

У 1899 годзе, у 47-гадовым узросце, памірае а. Іаан Пісканоўскі. Яго наступнікамі сталі па чарзе а. Міхал Жукоўскі, а. Мікалай Сасноўскі, а. Павал Страшкевіч, а. Арсеній Шырынскі ды а. Зіновій Чаквін, якому прыйшлося разам з прыхаджанамі падацца ў бежанства.

* * *

У ваенным 1914 годзе некаторыя мужчыны Грыневіцкага прыхода былі мабілізаваны ў армію. Нішто аднак не прадвяшчала, што неўзабаве амаль усе праваслаўныя жыхары пакінуць родныя дамы і гаспадаркі. У ліпені 1915 г. пачаўся вялікі рух на тракце з Бельска ў Нарву, што пралягаў побач Катлоў. Войска, а таксама і цывільныя грамадзяне перамяшчаліся на ўсход. Пад канец ліпеня прыхадскі, грыневіцкі клір пачаў рыхтавацца да эвакуацыі. Перш за

26 ЛЕВ 1895, с. 184, 500-502.
27 ЛЕВ 1899, с. 112-113.
28 ЛЕВ 1894, с. 234.
29 ЛЕВ 1900, с. 224.

ўсё было знятых сем званоў. 31 ліпеня былі яны адпраўлены са станцыі Бельск у маскоўскі артылерыйскі склад[30]. У наступных днях да эвакуацыі рыхтавалася іншая, цэнная, царкоўная маёмасць. 6 жніўня, якраз на свята Праабражэння Гасподня жыхары Грыневіч і Катлоў падаліся ў бежанства. Праз два-тры дні на лініі ракі Белай затрымаўся нямецка-расійскі фронт. Некалькі дзён ішлі ўпорныя баі[31]. У разгары бітвы апынулася грыневіцкая царква. На няшчасце, царква з яе даволі высокай званіцай, да таго распаложаная на пагорку, служыла наглядальным пунктам для расійскіх войскаў[32]. 9 жніўня немцы выстралілі ў яе напрамку запальныя снарады і яна, як запісаў а. Зіновій Чаквін, згарэла „со всем находящимся в ней имуществом"[33].

Бежанства для грыневіцкіх прыхаджан было адным з найцяжэйшых выпрабаванняў за апошнія стагоддзі. Цяжкая дарога, пражыванне на чужыне, жудасці рэвалюцыі, вяртанне ў разбураныя вёскі — усё гэта многім стала перажываннем не пад сілу. Супрун Кавярда, даваенны настаўнік, ураджэнец Катлоў у газеце „Наша думка" кранальна апісваў пасляваенны выгляд роднай вёскі і лёсы яе жыхароў: „Амаль не на палову вёска знішчана пажарам. Згарэла ўся левая старана вуліцы калі ісьці ад Бельска. Гумны зьнішчаны на дзьве трэці, толькі пасяродак ухаваўся. Уцэлела й школа, што была даўней прыгажством вёскі. Ды цяпер, бяз вокнаў і дзвярэй, яна моцна засмучаець сваім выглядам. Вярнуліся дагэтуль 42 сям'і (выехала ўсяго 98 сем'яў). Але як вярнуліся? Старыя й дзеці блізка што паўміралі ў дарозе... Шмат паўмірала ўжо вяруўшыхся, галоўным чынам ад тыфуса. Памерлі Пацэвіч, Жукоўскі, Гаўрылюк, людзі саўсім маладыя. Ад сям'і Карніла Сахарчука, сям'і ў 10 душ, застаўся толі 1. Некаторыя сямейства саўсім павымяралі... Трапілась даведацца, што самым цяжкім часам для паварочаных бежанцаў была зімка 1918-1919 г. Калі-б не амэрыканскія камітэты помачы, то ўсе бы ўцалелыя ад доўгіх туляньняў па сьвеце дзеці напэўна не перажылі-б гэтае зімы, загінуўшы ад голаду і хвароб. На жаль, гэтае падмогі цяпер тут болей не даецца. Кажу на жаль, бо і цяпер яшчэ надта многа дзяцей тут галадуе"[34].

Пасля пажару царквы і эвакуацыі амаль усіх прыхаджан Грыневіцкі прыход фактычна перастаў існаваць. Не ўдалося яго адна-

30 АСР, Главная опись... к. 1v.

31 На пачатку Грыневіч-Вялікіх, з боку Бельска, на пагорку распаложаны могільнік нямецкіх і рускіх салдат, загінуўшых у жніўні 1915 г.

32 Сапрон Ковэрда, *Па разбураных мясцох Беларусі*, „Наша Думка" 1921, н-р 9, с. 4.

33 АСР, Главная опись..., к. 1.

34 Сапрон Ковэрда, там жа.

віць і пасля вяртання яго жыхароў з бежанства. Паводле планаў дзяржаўных улад, прыход у 1921 г. быў ліквідаваны і далучаны да прыхода Прачысценскай царквы ў Бельску. У ведамстве настаяцеля гэтай царквы а. Васілія Кастыцэвіча апынулася справа рэвіндыкацыі маёмасці грыневіцкай царквы. 4 ліпеня 1923 г. а. Зіновій Чаквін паведамляў з Крынак а. Васілію Кастыцэвічу аб тым, што дзякуючы намаганням Сымона Якавюка з Беларускага пасольскага клуба званы з Грыневіч знаходзяцца ўжо ў Варшаве. Званы можна было ўзяць, аднак, толькі за высокай платай — 4 500 марак за кілаграм. Званы прыход канчаткова выкупіў[35].

Па-featureрознаму склаўся лёс іншага царкоўнага ўбранства, што было эвакуіраванае або схаванае на месцы. Запрастольны і напрастольныя крыжы, усё літургічнае начынне, Дарахраніцельніца, некалькі пар аблачэнняў, харугвы, плашчаніца, некалькі падсвечнікаў, Евангелле друку 1879 г. пасля вайны трапілі ў царкву ў Ласінцы[36].

Царкоўную зямлю (41,95 га) у міжваенны перыяд пераняла Дырэкцыя дзяржаўных лясоў з Седльцаў. Зямлю гэтую далі ў арэнду некальнкім гаспадарам з Грыневіч. У 1928-36 гадах, калі ў Грыневічах-Вялікіх праводзілася камасацыя зямель, узнятая была таксама справа продажу ці перадачы гаспадарам царкоўнай зямлі на ўласнасць.

Варта адзначыць, што ў 1928 годзе ў Грыневічах-Вялікіх было 60 гаспадароў (з гэтага больш за 20 праваслаўных сем'яў). Найбольшымі гаспадарамі былі тады Афанасій Навіцкі — 41 га, Баляслаў Грынявіцкі — 22 га, Іосіф Садоўскі — 22 га, Рыгор ды Кіпрыян Навіцкія па 18 га.

Мінулі гады II сусветнай вайны. Сярод жыхароў, галоўным чынам Катлоў, узнікла ідэя адбудовы спаленай царквы. Паводле ўспамінаў, старанні па яе адбудове пачаліся адразу пасля вайны, у час перасялення некаторых сем'яў у БССР. Для пабудовы верныя з Катлоў закупілі хату ў Трасцянцы каля Нарвы. Прывезлі яе і паставілі на грыневіцкіх могілках. У доме была наладжана капліца, якую верныя лічылі, аднак, часовай. Марылі пра адбудову храма даўняй велічыні. Іх намеры пачалі здзяйсняцца ў 1956 г.

У ліпені 1956 г. часовую капліцу разабралі і на яе месцы пабудавалі большых памераў храм. Матэрыялам паслужыла вялікая сялянская хата, купленая ў вёсцы Войшкі. Новую пабудову жыхары

[35] АСР, ліст а. Зіновія Чаквіна да а. Васілія Кастыцэвіча і ягонай матушкі Сафіі Келясцінаўны ад 4 ліпеня 1923 г. Найбольшы са званоў, падараваны а. Уладзіславам Шумікоўскім у 1751 г., да сёння знаходзіцца на званіцы Прачысценскай царквы ў Бельску. Два іншыя старадаўнія званы знайшлі месца ў грыневіцкай царкве.

[36] Глядзі: Главная опись...

Катлоў і Грыневіч здзейснілі на працягу аднаго дня. Пабудова без дазволу царкоўных ды свецкіх улад выклікала адразу хвалю рэакцый. 1 жніўня 1956 г. бельскія павятовыя ўлады выклікалі а. Мікалая Крукоўскага, настаяцеля Прачысценскай царквы ў Бельску з мэтаю высветліць справу грыневіцкай царквы. Рэферэнт па справах веравызнанняў паведаміў святару, што пабудова апячатаная і адпраўляць у ёй багаслужбы забараняецца. Якраз 2 жніўня мела адбыцца традыцыйнае прыхадское свята св. Іліі Прарока. Свята, вядома, адбылося, але службу адпраўлялі перад апячатанай капліцай[37].

Да канца жніўня быў зроблены патрэбны для атрымання дазволу план царквы. Не ліквідавала гэта напружанай сітуацыі, якая стварылася вакол грыневіцкай царквы. 24 верасня 1956 г. Управа па справах веравызнанняў у Варшаве пераслала ў праваслаўную Мітраполію ліст у гэтай справе. Мітрапаліт у сваю чаргу „dał zarządzenie W. Księdzu dziekanowi niezwłocznie wyjaśnić, dlaczego taki wypadek zaistniał wbrew przepisom Władz Państwowych”[38].

Неўзабаве а. Мікалай Крукоўскі паслаў у Мітраполію даволі падрабязны паясняльны ліст. З цягам часу справа грыневіцкай царквы пачала залагоджвацца. Прыхаджане даводзілі будынак да парадку, узбагачалі яго новым убранствам[39]. Над прытворам была дабудавана званіца. На ёй былі завешаны, між іншым, два званы са старой грыневіцкай царквы, якія з 1923 г. перахоўваліся ў Бельску.

Царква св. Іліі Прарока ў далейшым з’яўляецца філіяльным храмам Прачысценскага прыхода ў Бельску. Урачыстыя багаслужэнні адбываюцца тут у дзень прастольнага свята 2 жніўня, у свята Увядзення ў Храм Дзевы Марыі, на трэці дзень Хрыстовага Нараджэння, трэці дзень Пасхі, трэці дзень Святой Тройцы ды суботу перад нядзеляй аб Самаранцы. Тады прыхаджане з Катлоў спаўняюць традыцыйны *абход* палёў[40]. Свой *абход* маюць таксама Грыневічы.

Вёскі былога Грыневіцкага прыхода за апошнія дзесяцігоддзі вельмі абязлюднелі. Асабліва гэтую крызісную дэмаграфічную сітуацыю наглядаецца ў Катлах і Грыневічах-Двары. Прывязанасць да веры продкаў і пашанаванне традыцыі, аднак, абнадзейваюць, што гэтыя мясцовасці, фактычнае прадмесце Бельска, пачнуць ізноў дыхаць паўнатою жыцця.

[37] АСР, копія ліста а. М. Крукоўскага ў Мітраполію з канца верасня 1956 г.

[38] АСР, ліст праваслаўнай Мітраполіі да а. Мікалая Крукоўскага ад 26 верасня 1956 г.

[39] Асаблівую ўвагу у грыневіцкім храме прыцягваюць царскія вароты XVII ст. з рэзбленымі выявамі Евангелістаў. Былі яны прывезены сюды з Кленік, дзе некалі знаходзіліся ў царкве.

[40] Традыцыйныя *абходы* былі забаронены цывільнымі ўладамі ў 50-я гады і адноўлены на пачатку 90-х.